Источник: “Голас Радзімы” – 2015-01-29

# Стваральная сіла

## Круглы стол “Моладзь. Навука. Інавацыі” прысвячаўся Дню беларускай навукі

Штогод у апошнюю нядзелю студзеня адзначаецца такое свята: Дзень беларускай навукі. Гэта і знак павагі грамадства да ўсіх, хто працуе ў “інтэлектуальнай” сферы, і нагода пацікавіцца: ці ідзе беларуская навука ў нагу з часам? Пра тое, у прыватнасці, гаварылі на прэс-канферэнцыі Міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў, Старшыня Дзяржкамітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін і старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў.

А ў Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы з гэтай нагоды прайшоў круглы стол “Моладзь. Навука. Інавацыі”. Яго ўдзельнікі адзначалі: сёння беларускім навукоўцам важна не толькі праводзіць перспектыўныя даследаванні, але і вучыцца ўкараняць новыя тэхналогіі ў вытворчасць. У прыватнасці, абмяркоўвалася ідэя стварэння навукоўцамі так званай паралельнай эканомікі. Тэма, заўважым, ужо і не новая. Праблема ж у тым, што хоць і ёсць неабходная нарматыўная база, іншыя ўмовы для з’яўлення і эфектыўнага развіцця невялікіх інавацыйных прадпрыемстваў, аднак іх яшчэ вельмі мала. А буйныя прадпрыемствы, як правіла, не заўсёды маюць сродкі для ўкаранення новых распрацовак навукоўцаў.

У цікавай размове за круглым сталом абмяняліся сваімі арыгінальнымі ідэямі, думкамі гісторыкі, журналісты, маладыя навукоўцы. У бібліятэцы ж была арганізавана і тэматычная выстава выданняў, прысвечаная Дню беларускай навукі.